Сачыненне “Што такое адзінства?”

Пітэнка Апалінарыя,
вучаніца 10 класа ДУА “Сярэдняя школа
№16 г.Брэста імя Героя Савецкага Саюза
А.М. Карасёва”

Што такое адзінства? Менавіта такую тэму выбрала для Вані настаўніца беларускай мовы і літаратуры. Справа ў тым, што жанчына добра ведала сваіх вучняў і таму дала кожнаму сваю тэму для навучальнага сачынення. Ваня спытаўся ў аднакласнікаў пра іх тэмы і вырашыў, што ўсім, акрамя яго, пашанцавала. У астатніх тэмы былі лёгкімі і зразумелымі: у Машы – “Што такое сяброўства?”, у Лёшы – “Што такое дабрыня ?”, а ў Арыны, выдатніцы, тэма “Мая Беларусть”. “Канешне, на такія тэмы любы напіша”, – думаў хлопчык. Але час здаваць сачыненне набліжаўся і таму давялося брацца за працу.

Спачатку Ванька напісаў пра сваю ўнікальнасць і незвычайныя здольнасці, якіх ні ў каго няма. Хлопец ужо дапісваў работу, калі сястра вярнулася з універсітэта. Ванька пачаў чытаць ёй сваё сачыненне, а дзяўчынка рассмяялася. Яна патлумачыла брату, што адзінства – гэта не пра незвычайнасць. Ванька задумаўся і пачаў яшчэ больш зайздросціць сваім аднакласнікам. Не! Зараз ён канчаткова заблытаўся і дакладна не напіша гэтае сачыненне! Сястра паспрабавала падбадзёрыць Ваньку, але той ужо страціў надзею і быў гатовы атрымаць сваю двойку. Засмучаны, ён кінуў ручку і пайшоў глядзець новую серыю свайго любімага мультфільма.

Мінула гадзіна, дзве, стрэлка набліжалася да пяці гадзін... “Хутка павінна прыйсці мама ”, – прамільгнула думка ў галаве Ванькі. Хлопчык падумаў, што матуля абавязкова спытае пра сачыненне, бо ён ўчора горда заявіў, што самастойна напіша гэтую работу і абавязкова атрымае дзясятку. Ванька рашуча пайшоў у пакой, сеў за стол, дастаў з-пад стала ручку, якую закінуў туды пасля апошняй спробы што - небудзь напісаць.

У галаве было пуста. Ваня проста не ведаў, пра што яму расказваць. Узгадаўшы пра старэйшую сястру, хлопец пайшоў да яе ў пакой. Сястра ляжала на ложку і чытала нейкую мудрагелістую, на думку брата, кнігу. Ваня папрасіў дапамагчы яму, бо ён проста не разумеў, што такое адзінства. Сястра засмяялася, але паспрабавала растлумачыць хлопчыку значэнне гэтага паняцця. Але і пасля слоў дзяўчынкі пытанняў заставалася шмат, Ванька папрасіў прывесці прыклады. Сястра яшчэ падумала і павяла брата на кухню. Там яны ўбачылі, як сабака дапамагае кату залезці на стол. Пасля некалькіх няўдалых спроб у ката атрымалася заскочыць на стол і ён лёгка скінуў адтуль бутэрброд, які Ванька не даеў пасля школы. Кот і сабака хутка падзялілі сваю здабычу.

“Глядзі, якое ў іх адзінства”, – засмяялася дзяўчынка. Пасля яна прывяла яшчэ шмат прыкладаў з жыцця сваіх знаёмых і сяброў. Сястра расказала брату пра адзінства ў іх сям'і, пра адзінства ў яго класе і пра адзінства ўсіх людзей у нашай краіне. І пра сям’ю, і пра клас Ваня зразумеў адразу, а пра адзінства ўсіх

людзей у краіне ён ніяк не мог уцяміць. Ну як жа ён, Ваня, можа быць адзіным з незнаёмымі людзьмі ўсёй краіны? Для чаго? Дзяўчына пасур’ёзнела і сказала брату, што мы ўсе адзіныя таму, што ў нас адна Бацькаўшчына – Беларусь, адна мова, адны звычаі , якія адвеку перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Сястра патлумачыла, што народу важна быць адзінымі, каб пераадольваць любыя цяжкасці і дасягнуць пастаўленых мэт, захаваць мір і згоду ў грамадстве, паважаць гісторыю і культуру нашай краіны, захаваць самабытнасць беларускай нацыі. Яна дала зразумець брату, што Рэспубліка Беларусь захоўвае сваю незалежнасць і суверэнітэт дзякуючы народнаму адзінству і вялізнаму інтэлектуальнаму і творчаму патэнцыялу людзей таленавітых, кваліфікаваных, шчыра жадаючых прынесці карысць свайму народу.

І тады Ваня зразумеў, што ў адзінстве нашага народа – сіла народа, што аб'ядновае людзей у імя развіцця сваёй краіны. Адзінства народа – гэта той падмурак, які дапаможа нам захаваць сённяшнія набыткі і дасягнуць новых вяршынь у будучыні.

Вечарам хлопчык напісаў сачыненне нават хутчэй, чым звычайна. Ён пайшоў у школу з поўнай упэўненасцю, што яго работа ўразіць настаўніцу. І, безумоўна, Ваня атрымаў дзясятку. Настаўніца пры ўсім класе хваліла сачыненне, а для хлопца выдатная адзнака стала прыемным бонусам да яго новых ведаў, бо зараз ён быў упэўнены, што адзінства – гэта адна з самых важных каштоўнасцей у жыцці чалавека і грамадства.